Падтрымай "Вясну" на PATREON

За каментар пра Караева мінчука асудзілі да чатырох гадоў "хатняй хіміі" і прымусовага лячэння

22.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск

У судзе Ленінскага раёна вынеслі прысуд 48-гадоваму Дзмітрыю Пашкевічу. Яго прызналі вінаватым паводле арт. 364 Крымінальнага кодэксу і асудзілі да чатырох гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову, а таксама — да прымусовага лячэння: Пашкевіч мае псіхалагічныя асаблівасці.

Справу разгледзела суддзя **Марына Запаснік**.

Каментар на спартовым сайце

Дзмітрыя Пашкевіча прызналі вінаватым, што 28 верасня ён размясціў на спартовым сайце "Трыбуна" каментар, у якім змяшчалася падахвочванне да здзяйснення гвалту над міністрам МУС Караевым. У каментары прысутнічалі словы "трэба забіць...". Паведамленне было выяўленае падчас маніторынгу спецыяльным аддзелам на наступны дзень.

Пашкевіча затрымалі 28 студзеня, тады ж з дома была вынятая тэхніка.

"Адчуваў злосць да тых, хто збіваў людзей"

На паседжанні падчас допыту пракурорам высветлілі, што паведамленне сапраўды размясціў Дзмітрый. Ён напісаў гэта пад уздзеяннем моцных эмоцый ад гвалту — збіцця грамадзян супрацоўнікамі міліцыі. У той момант не аддаваў сабе справаздачу, што піша: яму "было страшна глядзець на гэта", ён адчуваў злосць да міліцыянтаў — не да ўсіх, а тых, хто збіваў людзей.

Пашкевіч раскайваўся, але ён распавёў: не думаў, што праз паведамленні ў Інтэрнэце хто-небудзь возьме палку і пойдзе біць, і не хацеў гвалту над міністрам.

> ***— Але вы б хацелі, каб яго дзейнасць (маецца на ўвазе выкананне службовых абавязкаў міністра ў той момант) скончылася***? — запытаў пракурор.
> — Я на той момант дрэнна цяміў. Я прынёс прабачэнні.
> ***— Вы хацелі перашкодзіць гэтай дзейнасці?***
> — Я не хацеў перашкаджаць.
> ***— Вы б хацелі змяніць характар гэтай дзейнасці?***
> — Я хацеў, каб перасталі біць людзей. Я не магу ўспомніць.

Дзмітрый таксама адмаўляў матыў помсты, але прызнаў віну перад міністрам за тое, што напісаў такі неадэкватны пост.

"Працаваць нідзе не бралі"

Адвакат падкрэсліў псіхалагічны стан абвінавачанага. Дзмітрый цалкам знаходзіцца на ўтрыманні бацькоў: восем год не працуе наогул, бо "нідзе не бралі". Таксама абаронца звярнуў увагу на раскаянні і прынесеных прабачэннях.

Маці Дзмітрыя Галіна Балеславаўна пацвердзіла дыягназы сына: адзначыла, што праз асаблівасці развіцця ён не хадзіў у дзіцячы садок. З дзяцінства Дзмітрый меў ДЦП, дагладаць за ім дапамагала бабуля. *"Школу ён закончыў моўчкі: не мог адказваць на занятках"*, — сказала маці. Дзесяць класаў ён закончыў толькі дзякуючы лекарам. Зараз Дзмітрыю патрэбная гаспіталізацыя, каб усталяваць "холтэр" праз высокі ціск: ёсць дакументы, якія гэта пацвярджаюць.

Прызнаўся добраахвотна

Сведка **Дзяніс Лобан** распавёў, што ягоным аддзелам праводзіўся маніторынг пагроз прадстаўнікам улады. У выніку чаго выявілі каментар абвінавачанага, даведаліся ягоны IP-адрас і прозвішча. Паколькі камп'ютарам, з якога пакінулі каментар, карысталася ўся сям'я, не адразу высветлілі, хто менавіта пісаў каментар: спачатку быў арыштаваны бацька абвінавачанага, бо Дзмітры сказаў, што не пісаў каментар. Аднак Дзмітры Пашкевіч увёў пароль пошты, які ведаў толькі ён, калі яго даставілі ў СК, дзе і знайшлі пацверджанне, што паведамленне адаслана з ноўтбука. Ідэнтыфікацыя абвінавачанага адбылася праз карыстальнікаў форума "Прэсбола". У той жа дзень Дзмітрый прызнаўся і выказаў шкадаванні.

На момант арышту ніхто не ведаў прычыну затрымання. *"Мы не хацелі адразу ім казаць, каб дакладна зразумець, хто менавіта з сям'і напісаў"*, — адзначыў Лобан.

Апытанне Караева

Да матэрыялаў справы далучанае апытанне пацярпелага Караева. Ён адзначыў, што расцаніў паведамленне як "пагрозу асабіста мне, міністру МУС". Таксама пацярпелы лічыць, што Пашкевіч *"дастаткова загладзіў віну перада мной"*, калі прынёс публічныя прабачэнні. І хаця матэрыяльных прэтэнзій да абвінавачанага ён не мае, лічыць, што злачынства было здзейсненае.

У справе ёсць таксама лінгвістычная экспертыза: у ёй сказана, што *"выказванняў, у якіх негатыўна ацэньваецца сам Караеў, не маецца"*, але ёсць негатыўныя заклікі да гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да Караева. Пры гэтым мяркуецца выбар зброі за *"адрасатам падахвочвання"*.

"Сацыяльная група, якая падвержаная ганенням"

У спрэчках абвінавачанне асабліва падкрэсліла як абцяжваючыя акалічнасць "палітычныя погляды" Пашкевіча: ягоныя шматлікія каментары нібыта красамоўна сведчаць пра гэта. Таксама ён прасіў суд на ўвазе тых абставінаў, якія склаліся ў нашай краіне, лічыць усіх супрацоўнікаў МУС пэўнай сацыяльнай групай, якая падвяргаецца ганенням.

Для Дзмітрыя Пашкевіча абвінаваўца запрасіў папрасіў **чатыры гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову: "хатнюю хімію". А таксама — прымусовае лячэнне.** Менавіта такое пакаранне і прызначыла суддзя Марына Запаснік.

Твитнуть







ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY